***Карпіевіч В. А.**, дацэнт кафедры гуманітарных навук Універсітэта грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

# ПРАДПАСЫЛКІ ФАРМІРАВАННЯ БУРЖУАЗІІ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XIX СТСТ.

# PREREQUISITES FOR THE FORMATION OF THE BOURGEOISIE IN BELARUS IN THE LATE XVIII – EARLY XIX CENTURIES

*У артыкуле разглядаюцца пытанні, якія тычацца прадпасылак фарміравання буржуазіі ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя. Аўтар разглядае спробы стварэння прамысловых прадпрыемстваў. Даследуецца вопыт памешчыцкіх гаспадарак па арганізацыі мануфактур, аналізуюцца прычыны няўдач у арганізацыі вытворчасці. На падставе статыстычных даных разглядаецца дынаміка росту і змяненняў у мануфактурнай вытворчасці ў першай палове XIX стагоддзя.*

***Ключавыя словы:** вытворчасць, прамысловыя прадпрыемствы, мануфактура, буржуазія, фарміраванне, рост.*

*The article deals with the issues concerning the prerequisites for the formation of the bourgeoisie in Belarus at the end of the XVIII-early XIX centuries. The author considers the attempts to create industrial enterprises. The experience of landlords farms on the organization of manufactures is investigated, the reasons of failures in the organization of production are analyzed. On the basis of statistical data the dynamics of growth and changes in the manufacture production in the first half of the nineteenth century is considered.*

***Keywords:** production, industrial enterprises, manufactory, bourgeoisie, formation, growth.*

На працягу існавання феадальнага грамадства дамінуючай сілай грамадства заставалася дваранства. У іх уласнасці былі зямля і праца залежных сялян. Сваё асаблівае становішча дваранства Расійскай імперыі захавала і пасля адмены прыгону. Аднак, нягледзячы на палітыку царызму, накіраваную на падтрыманне пануючага становішча дваранства, паступова ў недрах расійскага грамадства пачынае набываць моц новая сіла – буржуазія. Гэта таксама адбываецца, хоць і з пэўнымі асаблівасцямі, і на беларускіх землях. Буржуазія па сваёй сутнасці – гэта не маналітны клас, што яе і адрознівае, напрыклад, ад дваранства. Адной з адметных яе асаблівасцяў з'яўляецца занятак прадпрымальніцтвам.

Буржуазія на беларускіх землях фарміравалася за працяглы перыяд часу. На гэта пайшло амаль усё XIX ст. Аднак прадпасылкі да стварэння новага класа сталі з'яўляцца значна раней. Пры гэтым нельга адназначна залічваць да буржуазіі ўсіх тых, хто займаўся прадрымальніцтвам.

Па сутнасці прадпрымальніцкая дзейнасць развівалася на беларускіх землях з часоў Полацкага і Тураўскага княстваў. Яна характарызавалася ўзроўнем развіцця рамёстваў і гандлю (як унутранага, так і знешняга). Асобныя элементы прадпрымальніцтва можна прасачыць і ў сельскагаспадарчай дзейнасці. Такія з'явы назіраліся і ў часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Аднак, гэта нельга вызначаць як працэс фарміравання буржуазіі і буржуазных адносін. На гэта звяртаў увагу і беларускі

даследчык А.М.Люты. У сваёй працы, прысвечанай сацыяльна-эканамічнаму развіццю Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя, ён лічыў неабгрунтаванымі спробы даследчыкаў гісторыі беларускіх гарадоў знайсці карані буржуазных адносін у XV – XVI стст., а багатыя гарадскія вярхі паказаць як буржуазны клас [1, с. 16, 31-32].

Тым не менш, менавіта ў апошняй чвэрці XVIII ст. на беларускіх землях пачынае закладвацца першы падмурак будучых буржуазных адносін. І хоць мануфактурная вытворчасць у гэты час насіла эпізадычны характар, вопыт некаторых вытворцаў быў не зусім ўдалым, усё ж гэтыя першыя спробы ўжо ў XIX ст. далі магчамасць даць штуршок да развіцця буржуазных адносін і пачатку фарміравання беларускай буржуазіі.

Першым, хто стаў займацца прамысловай прадпрымальніцкай дзейнасцю на тэрыторыі Беларусі, было дваранства. У першай палове XVIII ст. пад уплывам таварна-грашовых адносін на беларускіх землях сталі ўзнікаць прадпрыемствы мануфактурнай вытворчасці, якія былі заснаваны на падзеле працы і ручной сіле. Аднымі з першых гэта былі шкляныя гуты ў Налібоках і Урэччы ва ўладаннях Ганны Радзівіл. Віленскі ваявода Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька) заснаваў у Нясвіжы ў 1752 г. суконную мануфактуру.

У 1751 г. была заснавана і вядомая Слуцкая мануфактура па вырабе шаўковых паясоў. Для арганізацыі працы на ёй Радзівіл запрашае Яна Маджарскага. Маджарскі змог наладзіць і пашырыць вытворчасць, што праз некаторы час дало магчымасць вырабляць на Слуцкай мануфактуры паясоў на суму ў 10 тыс. злотых штогод [2, с.55-56]. І хоць для арганізацыі вытворчасці запрашаліся іншаземныя спецыялісты, на мануфактурах выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян. Аднак, нягледзячы на пэўныя поспехі ўжо да пачатку XIX ст. пачынаецца зніжэнне вытворчасці паясоў і фабрыка паступова прыходзіць у заняпад.

У апошняй чвэрці XVIII ст. ствараецца шэраг мануфактур ва ўладаннях Агінскіх, Радзівілаў, Салагуба, Сапегі, Хрыптовіча і іншых. Таксама ў Беларусі спробы стварыць мануфактурныя прадпрыемствы рабіліся і каталіцкай царквой. Пры некаторых каталіцкіх касцёлах і манастырах з'яўляліся невялікія прадпрыемствы, аднак яны ў першую чаргу былі накіраваны на забяспячэнне ўнутраных патрэб.

Кіруючыя колы Рэчы Паспалітай таксама пачынаюць звяртаць увагу на неабходнасць аказваць садзейнічанне памешчыкам і мяшчанам, якія займаліся мануфактурнай вытворчасцю. Так, на Варшаўскім сойме у 1768 г. па наказу Гродзенскага павятовага сойміка паслы ўзнялі пытанне аб павелічэнні пошлін на прадметы раскошы, якія ўвозяцца з-за мяжы, і памяншэнне пошлін на замежную сыравіну для мануфактур [3, с. 271].

Цікавы вопыт па стварэнні мануфактурнай вытворчасці назіраўся ў Гродзенскай каралеўскай эканоміі, калі каралём Станіславым Аўгустам Панятоўскім на пасаду літоўскага падскарбія прызначаецца Антоній Тызенгаўз.

Па ініцыятыве Антонія Тызенгаўза ў Гродне і яго прадмесцях ствараецца шэраг каралеўскіх мануфактур – суконная, баваўняная, палатняная, шаўковых паясоў, зброевая, гарбарная, металічных вырабаў і іншыя. Для арганізацыі кіраўніцтва мануфактурамі былі запрошаны спецыялісты з краін Еўропы. Адтуль былі завезены станкі і інструменты, а значная колькасць сыравіны таксама ўвозілася з-за мяжы. Атрыманая прадукцыя накіроўвалася на продаж як унутры краіны, так і за мяжу.

Першапачаткова вытворчасць гродзенскіх прадпрыемстваў была паспяховай. Аднак па прычыне таго, што значная колькасць сыравіны завозілася з-за мяжы, альбо закуплялася ў іншых вытворцаў, расходы мануфактур былі высокімі. Толькі каля 5% сыравіны выраблялася



ў гаспадарках самой эканоміі [4, с. 65]. Гэта рабіла выпуск прадукцыі нерэнтабельным. Другой праблемай для дзейнасці Тызенгаўза было тое, што прадукцыя мануфактур была разлічана на багатых пакупнікоў, колькасць якіх у Рэчы Паспалітай была не такой і вялікай. Многія з магнатаў аддавалі перавагу замежным таварам.

Пасля адхілення А.Тызенгаўза з пасады, якую ён займаў да 1780 г., каралеўскія прадпрыемствы пачынаюць паступова зачыняцца. У 1805г. у адказ на запыт міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі аб дзейнасці суконнай фабрыкі ў Гродне, мясцовы губернатар адзначаў, што амаль усе каралеўскія мануфактуры, якія былі створаны ў Гродне і наваколіцах у 1766 г. спынілі сваё існаванне ў 1780 г. З іх толькі суконная працягвала дзейнічаць да 1790г. [5, с. 225-226]. Адной з прычын заняпаду губернатарам называлася звальненне А.Тызенгаўза.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай на тэрыторыі новаўтворанай у Расійскай імперыі Магілёўскай губерні ва ўладаннях Пацёмкіна, Зорыча і Галынскага ствараюцца прадпрыемствы для абслугоўвання Чарнаморскага флоту – ветразевыя, палатняныя, канатныя. Аднак іх дзейнасць таксама была нядоўгай. Пасля смерці Пацёмкіна і Зорыча ў канцы XVIII ст. амаль усе мануфактуры ў іх магілёўскіх уладаннях спыняюць сваю дзейнасць.

Тэндэнцыя да закрыцця прамысловых прадпрыемстваў назіралася і ў іншых уладаннях. Большасць мануфактур, якія ўзніклі ў XVIII ст. і былі заснаваны на працы прыгонных сялян, спыняюць сваю дзейнасць. Па няпоўных звестках Мануфактур-калегіі аб прамысловых прадпрыемствах ў Беларусі за 1797-1803 гг. тут дзейнічала 5 папяровых, 1 шкляное, 1 фаянсавае, 5 палатняных, 11 суконных прадпрыемстваў [6, с. 126-131]. Амаль усе яны належалі памешчыкам, толькі на асобных з іх працавалі вольнанаёмныя рабочыя.

У той жа час дакументы сведчаць, што ў канцы XVIII ст. у Беларусі з'яўляюцца мануфактуры, якія належаць купцам і мяшчанам. На іх выкарыстоўваецца ў асноўным праца вольнанаёмных. Таксама назіраецца здача памешчыкамі сваіх прадпрыемстваў у арэнду.

У пачатку XIX ст. на беларускіх землях мануфактурная вытворчасць па-ранейшаму не атрымала шырокага распаўсюджання. Гэта ў пэўнай ступені клапаціла мясцовыя ўлады. У гэты перыяд на тэрыторыі новых губерняў, якія былі ўтвораны на землях былой Рэчы Паспалітай, была размешчана вялікая колькасць рускіх войск. Для ўтрымання вайсковых гарнізонаў патрабавалася не толькі вялікая колькасць правіянту, але і забеспячэнне рознымі матэрыяламі – абмундзіраванне, посуд, мэбля і іншае. Гэта, безумоўна, не магло не выклікаць рост колькасці фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, якія маглі б зарабіць на пастаўках розных рэчаў для арміі.

Аднак, як бачна з перапіскі паміж міністэрствам ўнутраных спраў імперыі і беларускімі губернатарамі, мясцовых памешчыкаў не цікавіла магчымасць зарабіць грошы на пастаўках войску розных тавараў, у першую чаргу – сукно і іншыя матэрыялы для пашыву абмундзіравання. Міністр унутраных спраў кн. А.Куракін разаслаў губернатарам цыркуляр, у якім прадугледжваліся мерапрыемствы для заахвочвання мясцовых памешчыкаў і яўрэйскага насельніцтва да адкрыцця суконных фабрык. На гэтыя мэты абяцалася выдзяленне з казны грашовай дапамогі [5, с. 227-228].

Аднак, як гэта сведчыць з адказаў Віцебскага, Віленскага, Гродзенскага і Мінскага губернатараў, нягледзячы на ўсе захады ўлад, мясцовыя памешчыкі фактычна не праяўлялі цікавасць да адкрыцця новых мануфактур. Тыя ж памешчыкі, якія мелі мануфактуры, адмаўляліся ад паставак сукна войску, сцвярджаючы, што вырабляюць сукно толькі для дамашняга спажывання. Сярод прычын, якія яшчэ называлі мясцовыя памешчыкі і мяшчане, важнейшай была дарагавізна сыравіны. Завозіць сыравіну з

іншых месц было не выгадна, а мясцовая авечкагадоўля, па іх словах, была слаба развіта. Яўрэйскае насельніцтва не мела ў дастатковай колькасці сродкаў, аднак выказвала згоду працаваць на такіх прадпрыемствах, калі яны будуць створаны [5, с. 229-233].

На пачатку XIX ст. на беларускіх землях працягваецца працэс стварэння мануфактур. Аднак ён па-ранейшаму не быў сістэматычны. Многія памешчыкі стваралі прадпрыемствы ў сваіх гаспадарках, але па розных прычынах яны хутка адмаўляліся ад прамысловай дзейнасці. З ліку тых мануфактур, якія былі заснаваныя ў XVIII ст., да 1800 г. засталося толькі 8 [2, с. 161]. Па падліках Н.Т.Раманоўскага, у канцы першага дзесяцігоддзя XIX ст. у Беларусі дзейнічала 33 мануфактуры, на якіх працавала 1529 рабочых [2, с. 160]. Пры гэтым даследчык сцвярджае, што ўсе астатнія лічбы завышаны, таму што ў справаздачах таго часу не раздзялялі рамесныя майстэрні і мануфактуры.

У першай чвэрці XIX ст. назіраецца невялікі рост мануфактур. Так, у 1815 г. іх дзейнічала ў Беларусі 35, а ў 1825 г. іх лік вырас да 40. Павялічылася і колькасць рабочых на мануфактурах. У 1815 г. на 35 мануфактурах працавала 1128 рабочых з ліку прыгонных і 1125 вольных, а ў 1825 г. іх колькасць павялічылася адпаведна да 1633 і 1247 чалавек [2, с. 171].

Як адзначаў М.Ф.Болбас, з 1828 па 1845 г. павелічэнне колькасці мануфактур затармазілася. За гэты перыяд у Беларусі ўзнікла толькі 17 новых мануфактур, у асноўным у суконнай вытворчасці [4, с. 68]. А да адмены прыгону гэты працэс яшчэ больш запаволіўся.

У цэлым да сярэдзіны XIX ст. назіраецца рост колькасці прамысловых прадпрыемстваў. Найбольш за ўсё іх колькасць павялічваецца за кошт вінакурных заводаў. У 1845 г. ў Мінскай губерні дзейнічаў 991 вінакурны завод, на трэцяй частцы з іх працавала звыш 500 рабочых. У беларускіх паветах Гродзенскай і Віленскай губерняў дзейнічала адпаведна 528 і 450 вінакурняў [6, с. 364-365]. Напярэдадні адмены прыгону ў беларускіх паветах Магілёўскай губерні дзейнічала 177 фабрык і заводаў, Віцебскай – 114, Мінскай – 64, Гродзенскай – 157 [6, с. 386-413]. Па-ранейшаму значная частка з іх належала памешчыкам, на іх актыўна выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян.

Як сведчаць разнастайныя крыніцы, мануфактурныя прадпрыемствы на беларускіх землях узнікалі ў першую чаргу ва ўладаннях буйных памешчыкаў. На стварэнне аднаго прадпрыемства неабходна было затраціць вялікія сродкі. Прычынай гэтаму была дарагавізна абсталявання, якое ў асноўным прыходзілася набываць за мяжой. Таксама для арганізацыі вытворчасці неабходна было, асабліва на першым этапе, запрашаць замежных спецыялістаў, аплата працы якіх таксама была даволі высокай. Так рабілі Радзівілы, Антоній Тызенгаўз і іншыя. Не малую долю сярод выдаткаў складаў і кошт сыравіны. Многія уладальнікі прадпрыемстваў закуплялі яе за мяжой альбо ў іншых вытворцаў на ўнутраным рынку. Наладзіць вытворчасць якаснай сыравіны ў сваіх гаспадарках, на думку памешчыкаў, таксама было складана.

У асноўным кіраваць справамі на мануфактурах прызначаліся кіраўнікі тых памесцяў, дзе была арганізавана вытворчасць. Многія з іх таксама не валодалі навыкамі кіравання прамысловымі прадпрыемствамі. У значнай ступені як памешчыкі, так і іх эканомы слаба валодалі ведамі аб механізмах рынку і збыту тавараў. Не заўсёды тавары мясцовых мануфактур маглі канкурыраваць з завезенымі. Абмежаванасць мясцовага рынку не дазваляла прадаваць выробленыя тавары ў вялікай колькасці, продаж прадукцыі на іншых рынках таксама быў абмежаваным. Рыначнай інфраструктуры як такой яшчэ ў гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі не існавала. Гандаль у асноўным насіў эпізадычны характар, адбываўся ў выглядзе абмежаваных па часе кірмашоў, заставаўся не развітым. У разглядаемы перыяд слаба былі развіты шляхі зносін, што таксама звужала магчымасці развіцця прамысловай вытворчасці.



Адзіным, што магло знізіць кошт выраблямай на мануфактурах прадукцыі, была танная праца прыгонных сялян, якую многія памешчыкі актыўна выкарыстоўвалі. Як сведчаць шматлікія даныя таго часу, у колькасным плане прыгонныя сяляне складалі аснову рабочай сілы прыгонных мануфактур. Нізкая кваліфікацыя прыгонных сялян не дазваляла дабівацца высокай якасці прадукцыі і росту прыбыткаў. Гэта яскрава прадэманстраваў эксперымент А.Тызенгаўза на гродзенскіх мануфактурах. Таму цяжка пагадзіцца з меркаваннем мясцовай даследчыцы С.А.Кудзій, якая сцвярджала, што прыгонныя сяляне, якія працавалі на мануфактурах, здольны выраблясь высакаякасную прадукцыю [7, с. 21].

Іншая справа назіралася на прадпрыемствах, якія ствараліся купцамі і мяшчанамі, дзе ў асноўным выкарыстоўвалася праца вольнанаёмных рабочых. Гэты працэс адбываўся і на памешчыцкіх мануфактурах, якія здаваліся ў арэнду. Усё больш на прамысловыя прадпрыемствы пранікалі капіталістычныя адносіны. На розных прадпрыемствах ручная праца актыўна замянялася механічнай з дапамогай энергіі вады, а пазней – і пары. Выкарыстанне вольнанаёмнай працы сведчыла аб тым, што напярэдадні адмены прыгону на тэрыторыі Беларусі ўжо дзейнічалі прамысловыя прадпрыемствы капіталістычнага тыпу. Менавіта такія прадпрыемствы былі больш канкурэнтаздольнымі.

Такім чынам, у канцы XVIII – першай палове XIX ст. адбываўся працэс складвання прадпасылак да фарміравання буржуазіі як новага класа грамадства. Першыя спробы дваранства па арганізацыі мануфактурнай вытворчасці не прынеслі значнага поспеху. І дваранства, якое спрабавала займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, яшчэ не ўспрымала сябе буржуазіяй. Памешчыкі не бачылі ў гэтым неабходнасці, яны і так адносіліся да пануючага ў Расійскай імперыі саслоўя і мелі шырокія правы і прывілеі. Прамысловая дзейнасць для памешчыкаў у асноўным была спробай палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. Таму, калі справы не былі ўдалымі і яны не атрымлівалі выгады, прадпрыемствы хутка ліквідаваліся. Тым не менш вопыт прамысловай дзейнасці і актыўнасці, які пачаў назапашвацца ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. будзе выкарыстаны ў больш позні час, калі ўзнікнуць лепшыя ўмовы для развіцця прамысловай дзейнасці. Усе тыя працэсы, якія разглядаліся, можна з поўнай упэўненасцю ахарактарызаваць як прадпасылкі, якія ствараліся для фарміравання буржуазіі ў Беларусі ў часы Расійскай імперыі.


1. Люты, А.М. Сацыяльна-эканамічнае развіцце Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя / А.М.Люты. – Мінск: БДПУ, 2004. – 320 с.

2. Романовский, Н.Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии / Н.Т.Романовский. – Минск: БГУ, 1966. – 425 с.

3. Белоруссия в эпоху феодализма в 3 т. Т. 2: С середины XVII до конца XVIII века до воссоединения с Россией / составители: А.И.Азаров и др. – Минск: Издательство АН БССР, 1960. – 559 с.

4. Болбас, М.Ф. Развитие промышленности в Беларуси (1775-1861 гг.) / М.Ф.Болбас. – Минск: Наука и техника, 1966. – 267 с.

5. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў 2 т. Т. II (1772-1903) / пад рэдакцыяй Н.М.Нікольскага, Д.А.Дудкова, І.Ф.Лочмеля. – Мінск, Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1940. – 938 с.

6. Белоруссия в эпоху феодализма в 3 т. Т. 3: Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX века (1772-1860) / составители: В.В.Чепко, В.В.Шатило. – Минск: Издательство АН БССР, 1961. – 624 с.

7. Кудий, С.А. Социально-экономическое развитие Гродно в конце XVIII – первой половине XIX века (1795-1861 гг.): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07.00.02 / С.А.Кудий. – Гродно, 1984. – 32 с.